УДК 745.522.011.26.046+929(476)"195"Кіш

*В. А. Лабачэўская*

# Дыскурсы міфатворчасці Алены Кіш

*У культуралагічным аспекце разглядаюцца сучасныя міфатворчыя інтэрпрэтацыі і віды мастацкай рэпрэзентацыі творчасці і асобы народнай мастачкі Алены Кіш. Акрэслены характар грамадскіх дыскурсаў, якія паўсталі вакол яе «райскіх» дываноў. Прааналізаваны разнастайныя факты прысутнасці міфалагізаванага вобраза мастачкі і рымейкаў яе твораў у беларускай культуры, выказаны меркаванні аб культурнай патэнцыі феномена міфатворчасці ў сучасным грамадстве.*

Цікавасць да творчасці народнай мастачкі Алены Кіш сфарміравалася ў 1970-я гг. Яе жыццю і творчасці прысвечаны публікацыі У. Басалыгі [1], Я. Куліка [9], У. Ягоўдзіка [15; 16], А. Усманавай [14], Л. Вакар [3; 4], А. Коўрык [8], Я. Сахуты [11], Р. Шауры [12], у якіх адлюстраваны розныя метадалагічныя пазіцыі і асабістае ўспрыманне аўтараў яе мастацтва. У апошняе дзесяцігоддзе ў беларускай культуры вызначыліся новыя сферы інтэрпрэтацыі творчасці і асабістага лёсу Алены Кіш: выяўленчае мастацтва, стрыт-арт, дакументальнае кіно, мастацкая літаратура і пачалася камерцыялізацыя створаных ёю вобразаў. Некаторыя аспекты гэтага працэсу знайшлі адлюстраванне ў артыкулах Н. Карасёвай [5], К. Карпіцкай [6].

*Мэты артыкула* – раскрыць прычыны папулярнасці творчасці Алены Кіш і праз аналіз культурных дыскурсаў, сфарміраваных вакол яе імя, прасачыць дзеянне механізма міфатворчасці ў сучаснай культуры.

Для сучаснікаў народнай мастачкі Алены Кіш і яе заказчыкаў – жыхароў слуцкіх мястэчак і вёсак, вытокі хрысціянскай іканаграфіі выяўленчых матываў яе дываноў[1] успрымаліся выключна на архетыпічным узроўні дзякуючы прыхаванаму рэзерву культурнай памяці. Ваяўнічы атэізм савецкай ідэалогіі знішчыў для пакаленняў грамадзян БССР хрысціянскія вобразы і тэмы. Да пачатку 70-х гг. XX ст. развіццё культуры беларускай вёскі імкліва змяняла свой вектар з інтравертнасці і замкнёнасці ва ўласных традыцыях на экстравертнае, адкрытае новаму ўспрыманню ўзораў гарадской культуры. Маляваны дыван да гэтага часу выканаў сваю місію пасярэдніка ў культурным абмене паміж вёскай і горадам, якая доўжылася амаль паўстагоддзя. Дываны сталі нямодныя, іх сімулякратыўнасць больш не задавальняла

[1] Пытанні вытокаў хрысціянскай іканаграфіі і гісторыка-культурныя фактары фарміравання вобразнасці і стылістыкі твораў народнай мастачкі разгледжаны аўтарам у артыкуле «Алена Кіш – стварэнне міфа», які апублікаваны ў папярэднім нумары «Весніка Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў». 2021. № 3 (41). С. 63–71.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вяскоўцаў, якія імкнуліся мець у хаце сапраўдныя фабрычныя дываны. Промысел маляваных дываноў заняпаў. Рэчы, якія калісьці вабілі вока і сагравалі душу незямной прыгажосцю вобразаў, страцілі для вяскоўцаў каштоўнасць.

Першая хваля грамадскай цікавасці да сапраўдных каштоўнасцей народнага мастацтва ўзнялася пасля хрушчоўскай адлігі і пераацэнкі афіцыйнага мастацтва сацыялістычнага рэалізму. У Беларусі яна праявілася некалькі запознена і паядналася з парасткамі нацыянальнага руху, які выспяваў у асяроддзі творчай інтэлігенцыі. Прафесійныя мастакі адкрывалі сапраўдныя каштоўнасці касцюма і арнаменту беларусаў, збіралі калекцыі народнага мастацтва, знаходзілі таленавітых майстроў і ўключалі іх творы ў кантэкст нацыянальнай культуры. Згадаем дзейнасць дамоў народнай творчасці і Лявона Баразны, камісіі па народным мастацтве Саюза мастакоў БССР, старшынёй якой у 1970-я гг. быў Яўген Кулік, а таксама існаванне сістэмы прадпрыемстваў народных промыслаў, мастацкае кіраўніцтва якімі ажыццяўляў Уладзімір Басалыга.

Менавіта ў гэты час грамадства адкрыла для сябе імя Алены Кіш на першай выставачнай рэпрэзентацыі яе дываноў. Нікому невядомая мастачка са Случчыны заняла годнае месца ў шэрагу выбітных постацей беларускай культуры.

Уладзімір Басалыга, вандруючы па вёсках роднай Случчыны, быў зачараваны райскімі вобразамі мастачкі, захоплены ўнікальным майстэрствам Алены Кіш. Тады яе дываны дабывалі апошні час жыцця ў вясковых хатах – дзе навідавоку, дзе схаванымі і змарнаванымі. Ён сабраў сціплыя звесткі аб жыцці і творчасці мастачкі і ў 1986 г. падрыхтаваў артыкул у Энцыклапедыю літаратуры і мастацтва Беларусі, адзначыўшы наіўна-рэалістычны характар творчасці і казачна-экзатычныя сюжэты яе дываноў [1].

Дываны Алены Кіш упершыню прадстаўлены мастацкай грамадскасці на I Рэспубліканскай выставе народных маляваных дываноў у 1978 г. у мінскім Палацы мастацтва. Яе творчасць была сапраўдным адкрыццём для наведвальнікаў. У асобе мастачкі са Случчыны беларусы займелі ўласны феномен народнага прымітыву, які не саступаў мастацтву знакамітых грузіна Ніка Пірасмані і ўкраінкі Марыі Прымачэнка. Эфект успрымання казачных дываноў узмацняўся іх яркімі і чыстымі колерамі. Гэтая акалічнасць важная, бо яна шмат у чым абумовіла далейшы працэс міфалагізацыі імя Алены Кіш і яе творчасці. Аўтэнтычныя дываны мастачкі, якія захаваліся не ў лепшым стане, для выстаўкі былі падноўленыя, «адрэстаўраваныя» Уладзімірам Басалыгам. Пажоўклыя, абы-якія па якасці і саставе фарбы (клеявыя, алейныя, друкарскія) былі перакрытыя паверх сучаснымі (гуашавымі і акрылавымі) і загучалі моцна, яскрава, дэкаратыўна. Рука прафесійнага мастака трохі



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выправіла контурныя лініі, надаўшы ім большай гнуткасці і пэўнасці. У падноўленым выглядзе дываны прачыталіся вельмі сучасна, вабілі мастацкай дэкаратыўнасцю. Пра гэты факт мала хто з даследчыкаў згадвае, але ён відавочны, калі параўнаць дываны пасля рэстаўрацыі з захаванымі аўтэнтычнымі. Нам ён падаецца важным для аналізу сучасных дыскурсаў міфалагізацыі творчасці народнай мастачкі.

Дзякуючы нацыянальна арыентаваным мастакам – Уладзіміру Басалыгу, Яўгену Куліку, Алесю Марачкіну, творчасць і дзейнасць якіх пашырыла ў грамадскай свядомасці пантэон беларускіх герояў і творцаў, Алена Кіш і Язэп Драздовіч пачалі ўспрымацца ў якасці нацыянальнага набытку. Я. Кулік і У. Басалыга адстойвалі мастацкую каштоўнасць беларускіх маляваных дываноў, дыскутавалі з гэтай нагоды з крытыкамі, якія беспадстаўна прылічалі іх да мяшчанскай пошласці і называлі безгустоўнасцю [9]. Артыкул Уладзіміра Ягоўдзіка [16] і складзены ім манаграфічны альбом твораў Алены Кіш [15], кнігі Яўгена Сахуты па народным мастацтве трывала ўпісалі ў 1980-я гг. Алену Кіш у беларускую культуру і мастацтва. Ацэнка ўнёску мастачкі ў нацыянальную скарбонку была сфакусіравана на фалькларызме вобразаў, роднасці іх міфапаэтычнаму ўспрыманню свету, характэрнаму для народнай культуры.

Імя Алены Кіш было замацавана і ў міжнародным кантэксце. Гэта быў час адкрыцця ў Еўропе мастацтва прымітыву, або наіўнага ці інсітнага мастацтва: ладзіліся трыенале «Insitus» у Брно, выстаўка «Іншыя» ў Варшаве, у Расіі сталі вядомымі імёны самабытных мастакоў-самавукаў, ствараліся значныя прыватныя калекцыі іх твораў. Вынікі разнастайных напрамкаў даследчыцкага, інстытуцыянальнага і грамадскага асэнсавання самакаштоўнасці непрафесійнай творчасці абагульніла «Энцыклапедыя сусветнага наіўнага мастацтва», складзеная ў 1985 г. мастацтвазнаўцам О. Біхалы-Мерынам. У яе ўключаны больш за 800 наіўных мастакоў і скульптараў з 50 краін свету, якіх прадставілі 32 эксперты – вядучыя спецыялісты па наіўным мастацтве ў сваіх краінах. У гэтай энцыклапедыі змешчаны артыкул «Алена Кіш» і фотаздымак дывана «Рай» [18, с. 355]. Факт прысутнасці ў такім прадстаўнічым выданні беларускага аўтара быў адзначаны на старонках газеты «Савецкая Беларусь» і сёння згадваецца ў публікацыях аб Алене Кіш. Варта ўдакладніць, аўтар артыкула Ніна Шкароўская ў энцыклапедыі не напісала, што Алена Кіш належыць Беларусі, а пазначыла – мастак з СССР. Адзначым таксама, што ў прасоўванні беларускай мастачкі для ўключэння ў сусветную энцыклапедыю, пэўна, меў дачыненне Міхась Раманюк (галоўны рэдактар часопіса «Мастацтва»), які падтрымліваў кантакты з маскоўскімі калегамі, што працавалі ў галіне народнага і наіўнага мастацтва. Фотаздымак дывана «Рай» для публікацыі ў энцыклапедыі перадаў М. Раманюку мастацтвазнавец Сяргей Харэўскі.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Варта зрабіць рэмарку. Да нядаўняга часу прачытаць артыкул пра Алену Кіш у сусветнай энцыклапедыі наіўнага мастацтва для беларускіх даследчыкаў і проста цікаўных было з'явай недасягальнай (убачыць гэтае аб'ёмнае выданне, выдадзенае на англійскай і венгерскай мовах, у Беларусі не мелася магчымасці). У снежні 2013 г. экзэмпляр кнігі (дзякуючы спонсарству К. Р. Цэрэтэлі) быў перададзены ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі.

Факты, прыведзеныя вышэй, можна абагульніць тэмай «нацыянальны дыскурс». Яны выпрацоўвалі ў грамадскай свядомасці міфалагізаваныя ўяўленні аб творчасці народнай мастачкі як заўважнай, адметнай частцы нацыянальнай культуры, узмацнялі ў свядомай беларускай інтэлігенцыі пачуццё нацыянальнай ідэнтычнасці. Факт уключэння Алены Кіш у нацыянальны пантэон, які зацвердзіў выпуск паштовай маркі з яе партрэтам і выявай дывана і памятнага канверта, прымеркаваны да 100-годдзя з дня нараджэння мастачкі. З цягам часу патэнцыя міфатворчасці постаці і творчасці Алены Кіш будзе ўсё больш узмацняцца.

Згадаем важную падзею ў гэтым працэсе – музеефікацыю мастацкай спадчыны Алены Кіш. У 1990-я гг. У. Басалыга перадаў большую частку дываноў Гісторыка-культурнаму музею-запаведніку «Заслаўе». Такім чынам, творы Алены Кіш набылі інстытуцыянальную прапіску і сталі дасягальныя для азнаямлення наведвальнікам музея, гледачам выставак, аматарам народнага мастацтва. Яны апублікаваны ў каталогу калекцыі маляваных дываноў музея [2, с. 21–23].

Тры працы Алены Кіш па-ранейшаму захоўваюцца ў сям'і У. Басалыгі. У 2020 г. на выстаўцы твораў графікі Уладзіміра і Андрэя Басалыгаў у мінскім Палацы мастацтва быў паказаны адзін з «райскіх» дываноў як сямейная рэліквія і своеасаблівы сімвал генетычнага вытоку сямейнай творчасці. Па словах У. Басалыгі, дываны, з якімі ён не змог развітацца, нарэшце падарыў сыну, таксама мастаку. Даў загад «ніколі іх не прадаваць, толькі ў выпадку вельмі цяжкага становішча. І з умовай, каб ён добра падумаў, каму аддае скарб, у якія рукі. Для мяне спадчына Кіш – галоўны скарб майго жыцця, шчасце зноў адкрыць чалавека, які аказаўся зоркай на нашым небасхіле» [6].

Агулам мастацкая спадчына народнай мастачкі складае 13 дываноў. Канешне, замала, але, як пераконваемся, дастаткова, каб жывіць новым зместам і сэнсам патэнцыю ўзмацнення ў беларускай культуры нацыянальнага міфа «Алена Кіш».

У пачатку 2000-х гг. на папярэдне закладзеным падмурку асэнсавання творчай асобы Алены Кіш як постаці нацыянальнай культуры выбудаваўся новы гендарны дыскурс, які ўключыў асобу мастачкі ў жаночую эліту творцаў беларускай культуры. Дыскурс гендару быў актуалізаваны дзякуючы распачатым даследаванням у Еўрапейскім гуманітарным універсітэце (мінскі перыяд яго дзейнасці). Гендарны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цэнтр пад кіраўніцтвам Алены Гапавай канцэптуальна здзейсніў далучэнне Алены Кіш да пантэона вялікіх жанчын Беларусі, што было прадэкларавана ў выданні ілюстраванага календара «Жанчыны-творцы Беларусі» ў 2002 г. У аповедах пра лёсы творчых жанчын у Беларусі розных эпох і іх месца ў грамадстве адна са старонак прысвечана Алене Кіш – народнай мастачцы дываноў са Случчыны. Тэкст, які быў пазней паўтораны ў выданні «Женщины на краю Европы», напісаны даследчыцай візуальнасці Альмірай Усманавай, якая ацаніла яе дываны як акно ў «прыватнае жыццё беларускай сялянкі, пратэст супраць шэрага будзённага жыцця, супраць жабрацкага быту абяздоленай беларускай вёскі» [14, с. 420].

Працяг гендарнага праекта адбыўся ў нашы дні. У 2019 г. выдавецтва «Галіяфы» ў серыі «Гендарны маршрут» выпусціла шостую ілюстраваную кнігу пра выдатных беларусак для дзяцей «Яна была: 16 жанчын, якія сталі часткай гісторыі Беларусі», прысвечаную біяграфіі народнай мастачкі з малюнкамі Лесі Пчолкі.

Гендарны падыход да аналізу творчасці Алены Кіш і іншых аўтараў беларускіх маляваных дываноў стасуе ў кандыдацкай дысертацыі па мастацтвазнаўстве і артыкулах Аксаны Коўрык [8]. Даследчыца піша пра зыходнае міфапаэтычнае мысленне ў якасці творчай першаасновы мастачкі, якое трансфармуецца пад уплывам эматыўнага вопыту жыцця, каштоўнасцей, ідэалаў. Спрабуючы вызначыць гендарную спецыфіку, яна параўноўвае дываны Алены Кіш і Язэпа Драздовіча, паказвае ў іх увасабленне «жаночага» і «мужчынскага» раю, адзначае жаночую творчую інтравертнасць мастачкі, апавядальнасць яе твораў, вызначае іх як жывапісны варыянт «інтымнага дзённіка», у якім узнаўляецца свет уласнай біяграфіі. Такім чынам, гендарны падыход актуалізаваў бяздольнасць прыватнага жыцця вясковай мастачкі ў якасці галоўнай канвы яе творчасці, у якую ўплецены самотныя вобразы гераінь дываноў і прароцкі сюжэт «дзева на водах».

Творчасць Алены Кіш пачынаючы з 80-х гг. XX ст. асэнсоўваецца ў разнастайных навуковых дыскурсах, ацэньваецца з пазіцый розных метадалагічных падыходаў. Мастацтвазнаўцы Л. Вакар [4], Я. Сахута [11], Р. Шаура [12] адносяць яе да наіўнага рэалізму, адзначаюць сувязь з фальклорнай асновай і прыродай нізавой гарадской культуры, генетыкай інсітнай творчасці, шукаюць у ёй адбітак мастацкай стылістыкі часу і ўвасабленне наіўнага мадэрну.

Звесткі пра промысел маляваных дываноў, характарыстыкі інсітнага мастацтва і творчасці мастачкі (з даследаванняў А. Коўрык, Р. Шауры, Л. Вакар) абагулены ў навукова-папулярным выданні «Песня аб райскім жыцці». У ім Наталля Русаковіч узмацняе міфалагічную аўру вакол імя і творчасці мастачкі, прыводзіць лічбу 300 дываноў, якія яна быццам бы стварыла за сваё жыццё [10, с. 20].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сферы мастацкіх практык візуальнасць дываноў Алены Кіш паступова пераасэнсавана ў якасці нацыянальна адметнага кода, які быў уключаны ў семантыку і прагматыку аўтарскіх выказванняў сучасных мастакоў. У агульных пошуках нацыянальных тэм, вобразаў і стылю беларускага выяўленчага мастацтва выкарыстанне і інтэрпрэтацыя мастацкай стылістыкі дываноў Алены Кіш зрабілася пэўнай тэндэнцыяй. Назавём гэты напрамак асэнсавання творчага здабытку народнай мастачкі і іншых творцаў маляваных дываноў «дыскурсам мастацкай інтэрпрэтацыі». Ён быў распачаты ў 80-я гг. XX ст. мастаком Алесем Марачкіным і працягнуты Віктарам Маркаўцом, якія паспрабавалі выкарыстаць форму і дэкаратыўную пабудову кампазіцыі маляванага дывана для стварэння жывапісных твораў станковага прызначэння на гістарычныя тэмы і прысвячэння іх постацям нацыянальнай культуры. Патэнцыяльныя выяўленчыя магчымасці такога падыходу спарадзілі некалькі творчых акцый, што далучылі да гэтага напрамку іншых мастакоў. У Заслаўі з 2001 г. Віктарам Маркаўцом і Таццянай Гаранскай ладзіліся пленэры маляваных дываноў. У 2005 г. Вольга Сазыкіна атрымала Гран-пры за дыван «Дзева на водах», выкананы ў дэкаратыўнай манеры і традыцыйнай для народнага мастацтва люстэркавай кампазіцыі з цэнтральнай выявай фігуры жанчыны ў калысцы-лодцы, што сімвалічна адсылае гледача да трагічнага вобраза Алены Кіш (мал. 1).

Спробай інтэрпрэтацыі міфалогіі народнай мастачкі стаў пленэр «З Аленай Кіш у сэрцы», які праходзіў у ліпені–жніўні 2016 г. па ініцыятыве групы «Мастацкі маёнтак» у «Культур-мультур сядзібе» на Лагойшчыне пры падтрымцы Цэнтра экалагічных рашэнняў і Святланы Воранавай (мецэнатка). Удзельнікі пленэру Ганна Балаш (творчы ідэолаг праекта), Аляксандра Дзямідава, Аляксандр Наўгародскі, Аляксандр Рэпка, адштурхоўваючыся ад вобразнасці і стылістыкі дываноў Алены Кіш, развівалі ў творах уласную міфалогію наіўнасці [7]. Выстава твораў у «Галерэі мастацтва» (Мінск) і Гісторыка-культурным музеі-запаведніку «Заслаўе» чарговы раз прыцягнула ўвагу грамадскасці да творчасці Алены Кіш і паказала новыя магчымасці мастацкай інтэрпрэтацыі яе спадчыны.

Вобраз Алены Кіш, матывы яе дываноў натхняюць беларускіх мастакоў розных пакаленняў. Скульптар Уладзімір Ламейка прысвяціў мастачцы 14 твораў у розных матэрыялах: камень, кераміка, дрэва, графіка, габелен, роспіс па тканіне (мал. 2). У якасці дыпломнай работы ў Акадэміі мастацтва ён стварыў помнік Алене Кіш «Дзева ў чоўне», выкананы ў выглядзе бетоннай лодкі, падобнай на тыя, што малявала сама мастачка. У. Ламейка стварыў керамічны паплечны партрэт мастачкі і скульптуру «Прысвячэнне», у якой постаць жанчыны-русалкі ў струменях спадаючых да долу ліній валасоў, нясе на сабе моцны і дабрадушны леў-ратавальнік, які ўвасобіўся ў камені з вобразаў кішаўскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дываноў. Надмагілле А. Кіш У. Ламейка пафарбаваў ва ўлюбёныя колеры мастачкі – сіні і жоўты. Яно ўсталявана ў 1996 г. на могілках в. Грозава Капыльскага раёна (мал. 3).

Напрыканцы першага дзесяцігоддзя XXI ст. вызначыліся новыя тэмы і напрамкі мастацкага ўвасаблення ў розных відах і жанрах творчасці, што былі справакаваныя навейшымі тэхнічнымі і медыйнымі магчымасцямі. Паказальна, што тэмы лёсу Алены Кіш і яе творчасці застаюцца актуальнымі для беларускай культуры.

Мастацкія падзеі апошняга часу сведчаць, што цікавасць мастакоў да тэмы Алены Кіш не згасае, з'яўляюцца новыя спробы яе асэнсавання і варыянты інтэрпрэтацый. Так, на фестывалі «Арт-Мінск-2020» адбылася прэзентацыя карціны Уладзіміра Вішнеўскага «Прысвячэнне Алене Кіш», у якой аўтар спалучыў выявы русалкі ў стылі ню і тыгра, які быццам бы прыйшоў з дываноў мастачкі на бераг ракі, у водах якой над патанулай жанчынай квітнеюць лілеі (мал. 4). Распазнавальная фабула сюжэта трагічнага лёсу Алены Кіш прадстае перад гледачом як візуальная метафара адвечнай тэмы злучэння і супрацьстаўлення бінарнасці «жаночага – мужчынскага». Карціна выклікае і вобразныя асацыяцыі з творам «Сон» прадстаўніка наіўнага мастацтва Анры Русо.

Надыход эпохі стрыт-арта ў Беларусі напрыканцы 2010-х гг. не абышоў тэму Алены Кіш і скарыстаў мастацкую стылістыку яе дываноў. Мастаку Максіму Восіпаву належыць цыкл маляваных дываноў «Адсябяціна». У стылістыцы кішаўскіх дываноў ён стварыў гарадскія муралы: «Гадзіла» (у гандлёвым павільёне рынку ў Маладзечне), выява Алены Кіш (аг. Чарэя Чашніцкага раёна Віцебскай вобласці), «Францыск Скарына вярхом на вялікай рыбе» (музей у Чашніках). Вынаходніцтва М. Восіпава – гэта манументальны стрыт-дыван, які арганічна ўпісаўся ў гарадскую прастору. У «дывановых» творах станковага і манументальнага прызначэння крэатыўны мастак узмацняе ўздзеянне знакавых матываў вядомых дываноў, падкрэслівае драпежнасць кішаўскіх птушак, звяроў, надае выявам пальмаў і кветак нейкую трывожнасць, і ўсё гэта міксуецца з вобразамі з іншага «кошыка» – знакавага арсенала класічнага жывапісу. Распазнавальныя гледачом матывы творчасці Алены Кіш і іх паўтаральнасць набываюць у творах Максіма Восіпава характар мема – асобнай знакавай адзінкі візуальнай інфармацыі. Такі прыём, як падаецца, вынікае з запозненай для беларускага мастацтва постмадэрнісцкай міксацыі і асабістага мастакоўскага сцёбу як мастацкага прыёму. Разам з тым ён успрымаецца як творчае адмаўленне (непрыняцце) аўтарам паточнага тыражавання ў сучаснай беларускай культуры вобразных матываў і стылістыкі вядомай мастачкі. Максім Восіпаў арганічна паглыбляецца ў стылістыку мастацкай мовы Алены Кіш. На мурале з яе выявай ён адлюстроўвае гераіню, калі яна вылівае ваду з чайніка (мал. 5), што сімвалізуе апладненне глебы нацыянальнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры. Струмень «перацякае» ў дэкаратыўную квяцістую акаймоўку выявы жылой прасторы з пабудовамі і персанажамі на перакрыжаванні вуліц. Такі краявід мог існаваць пры жыцці мастачкі, ён ажывае па-за межамі мурала на шэрым будынку ў асяроддзі сучаснага аграгарадка, дзе, здаецца, час спыніў свой гістарычны рух.

Мастацкія інтэрпрэтацыі творчасці Алены Кіш множыліся ў 2010-я гг., жывіліся павышэннем агульнага грамадскага градуса цікавасці да творчай спадчыны і гаротнага лёсу жанчыны-мастачкі. Таму спрыяла выставачная рэпрэзентацыя яе твораў. У 2013 г. на выстаўцы дываноў мастачкі «На шчасце» ў галерэі імя Міхаіла Савіцкага былі прадстаўлены ўсе 13 дываноў Алены Кіш з заслаўскага музея, калекцый Уладзіміра Басалыгі і Ірыны Пуставалавай (дзве маляванкі, выкананыя мастачкай па замове яе бацькоў; мал. 6). Два дываны Алены Кіш са збору заслаўскага музея былі рэстаўрыраваны ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі напярэдадні выстаўкі [13]. Праект пад куратарствам Таццяны Бембель быў ажыццёўлены пры спонсарстве Беларускага народнага банка, генеральны дырэктар якога Канстанцін Цэрэтэлі садзейнічаў выстаўцы ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі твораў свайго суайчынніка сусветна вядомага мастака-самавука Ніка Пірасмані са збору Нацыянальнага музея Грузіі (2008).

Папулярызацыі імя мастачкі паспрыяла дакументальная стужка «Маляваны рай» (2010), знятая на «Беларусьфільме» Галінай Адамовіч. Рэжысёр выкарыстала для стварэння яе вобраза шырокі спектр сродкаў аўдыявізуальнасці экраннага мастацтва [5]. Казачны рай Алены Кіш, спалучаны ў экранным часе з рэчаіснасцю будаўніцтва сацыялізму ў савецкай вёсцы («рай на зямлі»), супрацьпастаўляецца колерам чорна-белай дакументалістыкі. Два паралельныя светы – уяўны міфічна-казачны, створаны мастачкай, і рэальны, прыхарошаны савецкай кінахронікай, злучаны ў экраннай прасторы. Сціплыя біяграфічныя звесткі аб мастачцы ў закадравым тэксце кладуцца на дакументальныя кадры. Візуальны вобраз творчасці Алены Кіш перададзены сродкамі анімацыі: выявы дываноў уманціраваныя ў кадры кінахронікі (мал. 7), каляровыя застаўкі, у кветкавую аблямоўку якіх упісаны цітры, задаюць рытм фільму, кішаўскія вобразы ў ім ажываюць – рухаюцца, узлятаюць, рыкаюць. Варта адзначыць цікавую рэжысёрскую інтэрпрэтацыю вобразаў драпежных птушак мастачкі, якія ў фільме запаралелены з кадрамі атакі нямецкіх месершмітаў у часы Вялікай Айчыннай вайны. Драпежныя птушкі з ахвярамі ў кіпцюрах з дываноў успрымаюцца як прароцтва, алегарычнае прадбачанне жахлівай вайны.

Фільм «Маляваны рай» Галіны Адамовіч, новы па мастацкай форме, з'яўляецца першай у шэрагу разнастайных мастацкіх інтэрпрэтацый спробай упісаць творчасць і гаротны лёс Алены Кіш у кантэкст савецкай эпохі, увасобіць яе вобраз праз канфлікт «асоба – улада», надаць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

яму рысы ахвярнасці, прадвызначанай несумяшчальнасці творчага лёсу таленавітай мастачкі з татальным дамінаваннем несвабоды ў савецкай краіне.

Тэма атрымала працяг і развіццё ў тэатральным спектаклі «Прымітывы» (2019) Цэнтра візуальных і выканальніцкіх мастацтваў «Арткарпарэйшн» (рэжысёр Аляксандр Марчанка, сцэнарый Аляксея Андрэева, дэкарацыі Ганны Балаш) [17]. Дыскурс асэнсавання савецкага часу нашай гісторыі праз канву паўсядзённасці калгаснай вёскі, матэрыялізаванай у дзённікавых запісах аднавяскоўца мастачкі Рыгора Гардзея і вытрымках з газетных артыкулаў таго часу, увасоблены сцэнічнымі сродкамі праз актуалізацыю канцэпту «памяць». Відэакадры з тварамі і галасы нашых сучаснікаў – мастакоў, гісторыкаў, мастацтвазнаўцаў (Уладзімір Басалыга, Сяргей Харэўскі, Ганна Балаш, Таццяна Бембель, Галіна Адамовіч), якія шукаюць згубленыя факты жыцця Алены Кіш у яе родных мясцінах, разважаюць аб значэнні асобы мастачкі і яе творчасці ў грамадстве, ствараюць актуальны план прысутнасці культурнай памяці як сродку нацыянальнай ідэнтыфікацыі, спасціжэння набыткаў уласнай культуры. Спектакль запрашае гледача да эматыўнай і інтэлектуальнай рэфлексіі, пераасэнсавання спадчыны мінулага, разваг аб свабодзе творчасці мастака ў грамадстве. Асоба мастачкі, яе творчасць і лёс у спектаклі застаюцца на другім плане, у цьмянай прасторы міфа, што дае падставы разважаць пра гісторыю, культуру, час і асобу творцы.

Прэм'ерны паказ спектакля быў завершаны дыскусіяй «Вяртанне Алены Кіш: пазл ідэнтычнасці», у якой бралі ўдзел тыя, хто даследуе, прэзентуе, інтэрпрэтуе, камерцыйна выкарыстоўвае яе вобраз, імя і творчасць. Абмеркаванне ахапіла шырокую праблему: як працаваць са спадчынай, у якіх формах магчыма яе перапрацоўваць? Алена Кіш уяўлялася адным з элементаў пазла ідэнтычнасці, што ствараецца ў працэсе пабудовы грамадствам нацыянальнай будучыні.

Інфармацыя аб мастачцы, складзеная папярэднікамі міфалогія яе жыцця і творчасці, шырока трансліруюцца ў сучасных медыя. Найбольш чулая да тэмы нацыянальнага рэфлексіўная інтэлігенцыя пашырала міф аб мастачцы ў жывапісе, скульптуры, стрыт-арце, кінематографе, тэатры, упісваючы яго ў актуальныя дыскурсы і наратывы сучаснасці. Рэфлексія на тэму трагічнага лёсу народнай мастачкі ўвасоблена і ў мастацкай літаратуры, напрыклад, у аповесці Зараславы Камінскай «Русалкі клічуць» (2017). Аўтар, захапіўшыся гісторыяй жыцця Алены Кіш, яе мастацтвам, піша: «Я ўсё больш паглыблялася ў матэрыял і знаходзіла <…> новыя факты з яе біяграфіі <…> раскрывала яе не як гістарычнага персанажа, а як жанчыну, творцу, чалавека, які меў нешчаслівае жыццё і шчаслівае ўваскрэсенне» [6].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У наш час медыйнасць злучана з камерцыялізаванасцю публічнай прасторы. Зусім не выпадкова, што мастацкія знаходкі Алены Кіш брэндзіруюцца і дадаткова да свайго сімвалічнага нацыянальна-культурнага капіталу набываюць наяўны грашовы кошт, даюць рэальны прыбытак прадпрымальнікам.

Брэнд «Muraska Adzienne» Аксаны Ціпліцкай і дызайнера Марыны Ахмадавай у 2017 г. перавёў матывы дываноў Кіш у прынты жаночых шаўковых хустак. Папулярнасць візуальнай мовы Алены Кіш забяспечыла камерцыйны поспех калекцыі хустак. Прынты па матывах дываноў мастачкі выкарыстоўваюць іншыя брэнды моднага адзення (мал. 8), вытворцы цацак і сувеніраў. Камерцыялізацыя культурнай спадчыны апеліруе да людзей адукаваных, вытворцы арыентуюцца на іх як на патэнцыйных спажыўцоў. Чалавеку ўласціва жаданне валодаць прадметам свайго захаплення, любавання. Гэты фактар рухае стварэннем модных брэндаў і забяспечвае ім камерцыйны поспех. Да запатрабаванай грамадствам тэмы звярнуўся мінскі гадзіннікавы завод «Прамень» і выпусціў па матывах маляваных дываноў Алены Кіш лімітаваную калекцыю гадзіннікаў «Асоба» (мал. 9).

Падагульняючы вышэйсказанае, адзначым, што агляд напрамкаў, дыскурсаў, наратываў міфалагізацыі асобы Алены Кіш і яе творчай спадчыны адлюстраваны ў навуковых мастацтвазнаўчых і культуралагічных даследаваннях, у тым ліку гендарнага кірунку; практыках мастацкай інтэрпрэтацыі ў розных відах, жанрах і напрамках выяўленчага мастацтва, у тым ліку ў сферы стрыт-арта, у дакументальным кіно і тэатральных пастаноўках, мастацкай літаратуры; музейнай, выставачнай і пленэрнай рэпрэзентацыі; выдавецкіх праектах.

Творчасць знакамітай мастачкі, сцверджаная як адно з адметных дасягненняў беларускай спадчыны, становіцца часткай масавай культуры і нанова міфалагізуецца ў масавай свядомасці. Ці канчаткова вычарпала наша грамадства для сябе крыніцу творчасці інсітнай мастачкі з яе міфалагемай недасяжнага раю, казачна-фантастычнымі вобразамі, марамі аб каханні і зашыфраванай драмай самотнага лёсу, і, не шкадуючы, аддала гэты нацыянальны набытак для рыначнага спажывання? Адказ на пытанне застаецца па-за межамі нашага агляду напрамкаў і вынікаў амаль паўстагадовай нацыянальнай міфалагізацыі асобы Алены Кіш, адносіцца да галіны прагностыкі і будзе магчымы толькі ў кантэксце ўліку вектараў развіцця беларускай культуры, якія фарміруюцца.

1. *Басалыга, У. С.* Кіш Алена Андрэеўна / У. С. Басалыга // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. – Т. 3. – Мінск, 1986. – С. 61.

2. Беларускія маляваныя дываны : альбом-каталог з фондаў Гісторыка-культурнага музея-запаведніка «Заслаўе» / аўт. уступ. арт. і склад.: І. Арцем'ева, Ю. Малаш, А. Рак. – Мінск : Рыфтур, 2005. – 63 с.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Вакар, Л.* Кавалачак раю на шчасце / Л. Вакар // Мастацтва. – 2014. – № 2. – С. 44–47.
4. *Вакар, Л. У.* Наіўны мадэрн дываноў Алены Кіш / Л. У. Вакар // Мастацтва прымітыву і яго формы ў сучаснай культуры : матэрыялы навук.-практ. канф., якая адбылася ў межах IV Нац. выставы наіўнага мастацтва «Insita – 2012», прысвеч. 125-годдзю з дня нараджэння Марка Шагала, Віцебск, 4–5 мая 2012 г. / рэдкал.: Л. У. Вакар [і інш.]. – Мінск, 2013. – С. 78–82.
5. *Карасева, Н. А.* Создание аудиовизуального образа художника в документальном фильме Галины Адамович «Маляваны рай» / Н. А. Карасева // Мастацтва і асоба : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 22–23 лют. 2012 г. / рэдкал.: Т. С. Багданава (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012.– С. 396–397.
6. *Карпіцкая, К.* Непрызнаная мастачка Алена Кіш, райскія дываны якой праз дзясяткі год пасля яе смерці ратавалі з-пад кароў у хлявах [Электронны рэсурс] / К. Карпіцкая. – Рэжым доступу: https://nn.by/?c=lr&i=210920&fbclid=IwAR0Bwe5FB368koFqGjxhX8FWRQAXjUjSLh-5n54T9VXw1RIbHo5y7qsp6rc. – Дата доступу: 11.12.2020.
7. *Кліп, В.* Сучасная міфалогія: па выніках пленэру «З Аленай Кіш у сэрцы» / Вольга Кліп // Мастацтва. – 2016. – № 11. – С. 36–37.
8. *Коўрык, А.* «Мужчынскі» і «жаночы» рай у беларускай маляванцы / Аксана Коўрык // Роднае слова. – 2008. – № 10. – С. 108–110.
9. *Кулік, Я.* Беларускія маляваныя дываны / Яўген Кулік, Уладзімір Басалыга // Маладосць. – 1979. – № 3. – С. 159–163.
10. *Русаковіч, Н. В.* Песня аб райскім жыцці: маляваныя дываны Алены Кіш / Н. В. Русаковіч. – Мінск : Беларусь, 2016. – 71 с.
11. *Сахута, Я.* Райскі сад: [А. Кіш і яе дываны] / Яўген Сахута // Мастацтва Беларусі. – 1988. – № 3. – С. 57–58.
12. *Шауро, Г.* Феномен народной живописи в творчестве Язепа Дроздовича и Елены Киш / Григорий Шауро // Аўтэнтычны фальклор: праблемы захавання, вывучэння, успрымання : зб. навук. прац удзельнікаў VI Міжнар. навук.-практ. канф., Мінск, 27–29 крас. 2012 г. / БДУКМ ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – С. 15–18.
13. *Чайкоўская, В.* Шчасце Алены Кіш [Электронны рэсурс] / Вольга Чайкоўская // Звязда. – 2013. – 21 студз. – Рэжым доступу: http:// https://zviazda.by/be/news/20131221/1387611057-shchasce-aleny-kish. – Дата доступу: 28.01.2021.
14. *Усманава, А.* О творчестве художницы-примитивистки по росписи ковров / А. Усманова // Женщины на краю Европы. – Минск, 2003. – С. 420–422.
15. *Ягоўдзік, У. І.* Алена Кіш : альбом / У. І. Ягоўдзік. – Мінск : Беларусь, 1990. – 16 с.
16. *Ягоўдзік, У. І.* Дзівосны свет Алены Кіш / У. І. Ягоўдзік // Беларусь. – 1986. – № 9. – С. 19–20.
17. *Яроміна, К.* Прастора для рэфлексіі / Кацярына Яроміна // Мастацтва. – 2019. – № 8. – С. 34–35.
18. World Encyclopedia of Naive Art / ed.: Oto Bihalji-Merin, Nebojša-Bato Tomašević. – Scranton : Scala/Philip Wilson, 1985. – 735 p.

*V. Labacheuskaya*

**Discourses of Myth-Making by Elena Kish**

*The article examines modern myth-making interpretations and types of artistic representation of the creativity and personality of the People's Artist Elena Kish in the cultural aspect. The nature of the public discourses that arose around her "paradisal" carpets is outlined. The author analyzed the various facts of the presence of the mythologized image of the artist and remakes of her works in the Belarusian culture, considered the opinions on the cultural potential of the phenomenon of myth-making in modern society.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 15.07.2021.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ